(Минск, 2009); 6) Думанская Анастасия Александровна – лауреат I ступени в номинации народно-инструментальное исполнительство на Международном конкурсе исполнительского мастерства «Виват-Талант» (Санкт-Петербург, 2011); 7) Степанов Андрей Анатольевич – гран-при в сольной номинации на Международном конкурсе исполнителей на народных инструментах «Малахитовая шкатулка» (Санкт-Петербург, 2012); Лауреат II степени II Республиканского радиоконкурса «Маладыя таленты Беларусі» в номинации «инструментальная музыка» (2012); 8) Драмкова Мария Олеговна – лауреат I степени в сольной номинации на Международном конкурсе исполнителей на народных инструментах «Малахитовая шкатулка»( Санкт-Петербурге,2012); 9) Якшевич Янина Вячеславовна – лауреат III степени Международного конкурса «Рождественские ассамблеи»(Санкт-Петербург, 2012); Лауреат III степени II Республиканского конкурса «Спадчына» (2013); 10) Лащук Дмитрий Сергеевич – лауреат I степени IV Республиканского конкурса имени И.Добровольского в номинации «сольное исполнительство» (Минск, 2013).

Показателем возросшего мастерства духовиков-народников стали Международные и Региональные конкурсы исполнителей на народных духовых инструментах. Они показали возросшее значение этих инструментов, открыли имена талантливых выпускников, получивших звание артиста, подтвердили высокий авторитет преподавателей Белорусского государственного университета культуры и искусств, и качественную подготовку кадров на профессиональном уровне.

В XXI веке осуществляются дальнейшие поиски в области художественных возможностей народных духовых инструментов. В репертуаре капеллы «Гуды» звучат многочисленные сольные эпизоды, где раскрываются специфические тембровые и технические данные того или иного инструмента. Большой вклад в методику преподавания и популяризации народных духовых инструментов внес А.Л. Коротеев, кандидат искусствоведения, профессор кафедры духовой музыки БГУКИ, который принимал активное участие в разработке теоретических дисциплин, непосредственно связанных со спецификой изучения народных духовых инструментов.

Подводя итоги становления белорусской академической школы духовых народных инструментов и творческие итоги в развитии капеллы «Гуды» до 2016 года, можно отметить, что кропотливая работа И. Мангушева со студентами и его внимание к их профессиональному росту дали замечательные результаты. Этот коллектив – непременный участник ежегодных благотворительных концертов для учащихся общеобразовательных школ, ветеранов Великой Отечественной войны, для участников Международных конференций, форумов и концертов, посвященных городским и общегосударственным праздникам, международных фестивалей. Концепция школы осталась прежней (она ориентирована на академическую по форме интерпретацию народной музыки, но – интерпретацию средствами аутентичных, характерных для корневой культуры Беларуси народных духовых инструментов), насколько это верно – покажет время. Думается, что белорусская академическая школа духовых народных инструментов формируется в педагогическом и исполнительском ракурсе в тесной связи с другими восточноевропейскими школами, что может обусловить в будущем ее широкое международное признание.

**Список литературы:**

1. «Гуды» [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.buk.by/process/fakultet%203/Department%20of%20Wind%20Music/Gudy/. – Дата доступа : 09.04.2016.
2. «Псалтирь рифмотворная» [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://elar.urfu.ru/bitstream/10995/31783/1/evf_2007_03.pdf. – Дата доступа : 09.04.2016.

*Іна Алексніна*

## УПЛЫЎ ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЫ ТРУПЫ ІГАТА БУЙНІЦКАГА НА ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНАГА ТЭАТРАЛЬНАГА МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ

*У артыкуле раскрываюцца тэндэнцыі і асаблівасці дзейнасці Першай беларускай трупы пад кіраўніцтвам Ігната Буйніцкага, аналізуецца ўклад творчай спадчыны гэтага калектыву ў станаўленне прафесійнага тэатральнага мастацтва Беларусі ў пачатку XX стагоддзя.*

*Ina Aleksnina*

## THE INFLUENCE OF THE CREATIVE HERITAGE OF THE TRUPE LED BY IGNAT BUYNITSKY ON THE PROFESSIONAL THEATRE FORMATION IN BELARUS

*The article reveals trends and patterns of the work of the First Belarusian troupe led by I.Buynitsky, analyzes the contribution of this collective's creative heritage in the professional theatre formation in Belarus at the beginning of the 20th century.*

На сучасным этапе развіцця тэатральнай культуры і мастацтва, калі адной з адной з найактульнейшых праблем з'яўляецца страта нацыянальнай самабытнасці тэатральнага мастацтва нашай краіны і пошукаў новых форм сцэнічнай выразнасці, заснаванай на здабытках нацыянальнай культуры, даволі актуальным падаецца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пераасэнсаванне творчай спадчыны вядомага дзеяча сцэнічнага мастацтва І.Ц. Буйніцкага, родапачынальніка нацыянальнага прафесійнага тэатра Беларусі.

Пачынаючы з 1905 г. цэнтрам вечарынак аматараў тэатра, музыкі, танцаў, песень становіцца вёска Празарокі Глыбоцкай воласці. Ініцыятарам іх быў даследчык і знаўца народнай творчасці Ігнат Цярэнцьевіч Буйніцкі. Галоўнай перадумовай для арганізацыі Першай беларускай трупы ў першую чаргу можна назваць высокі ўзровень развіцця паратэатральных формаў у народнай творчасці і фальклорным тэатры і вопыт суседніх народаў і гастролі рускіх, польскіх і ўкраінскіх прафесійных калектываў на тэрыторыі заходняй часткі Беларускага Паазер'я.

Непасрэднае фарміраванне трупы і падрыхтоўка адпаведнага рэпертуару завяршаецца толькі ў жніўні 1910 г., перад паездкай па Беларусі, якая пачалася з выступлення ў Дзісне 21 жніўня. Неабходна заўважыць, што ядро трупы Буйніцкага склалі ўдзельнікі тэатральнага калектыва з Вільні: Л. і Ч. Родзевічы, Я. Арлоўскі, Уласенка, А. Бурбіс, А. Пашкевіч, Юрэвіч, М. Шыла, А. Ляжневіч [1, с. 43].

Значную ролю ў творчым жыцці калектыву пад кіраўніцтвам І.Ц. Буйніцкага адыграла творчая дзейнасць А. Бурбіса (сцэнічны псеўданім А. Аляксеенка), які паспяхова выступаў у якасці рэжысёра, дэкламатара, драматычнага акцёра. Удзельнікі тэатра набіралася з ліку жыхароў Празарокаў, Палівачоў, іншых беларускіх вёсак і мястэчак, дзе гастралявала трупа. У розны час у тэатры Буйніцкага ўдзельнічалі З.Абрамовіч (Забель), Д.Крывадубаў (Няленка), Карскі, Пракаповіч, А.Сабалеўскі (Копаць), С.Кукель, Мурашчанка, Міленка, Андрэева, І. Голер іінш ыя артысты-самародкі з народа, у тым ліку, дзве дачкі І. Буйніцкага Ванда і Алена, а таксама муж Ванды Я.Феакцістаў, які кіраваў хорам.

Удзельнікі тэатра з Вільні прынялі запрашэнне І.Ц.Буйніцкага і сталі адзіным калектывам з аднога боку па прычыне беднай матэрыяльнай базы і значнага ўціску з боку царскіх ўлад, з другога – імкнення да мастацкай творчасці на карысць беларускага народа. Буйніцкі, які меў шляхетныя карані і прафесію землямера, валодаў матэрыяльнымі сродкамі з прыбытку ад маёнтка і драўлянае памяшканне для рэпетыцый ў Палівачах.

Выступленні вандроўнай трупы І. Буйніцкага складаліся з 3-х або 4-х аддзяленняў: 1) пастаноўка п'есы; 2) выступленне хору; 3) сольныя спевы і дэкламацыя; 4) выкананне народных танцаў.

Сярод драматычных твораў, якія атрымалі сцэнічнае жыццё ў тэатры Буйніцкага, найбольшай папулярнасцю карысталіся «Па рэвізіі» і «Пашыліся ў дурні» ўкраінскага драматурга М. Крапіўніцкага і«Модны шляхцюк» К. Каганца. Акрамя таго, ставіліся «Міхалка» Далецкіх, «У зімовы вечар» («Рысь») паводле Э. Ашэшкі і«Сватанне» А. Чэхава. Кіраўнік тэатра звяртаў увагу на тую драму, якая была найбольш блізкай і зразумелай гледачу. «Інтэрнацыянальнасць» драматургічнага матэрыялу для сцэнічных паказаў трупы сведчыць і пра тое, што Буйніцкі не прытрымліваўся поглядаў нацыянальнай абмежаванасці. У рэпертуар трупы таксама ўключаліся надзённыя паэтычныя творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, М. Багдановіча, Я. Лучыны, К. Каганца, А. Паўловіча, А. Пашкевіч (Цёткі) іінш.

Харавыя спевы грунтаваліся на народнай песеннай спадчыне, аранжыраванай кампазітарам Л. Рагоўскім. Асаблівую цікавасць ў гледачоў выклікалі танцы «Мяцеліца», «Юрка», «Антошка», беларуская полька з прыпеўкамі, «Лявоніха», «Мельнік», «Аляксандра», «Каробачка», «Верабей», «Качан», «Гняваш», «Бычок», «Чабор» і іншыя, паказаныя на сцэнах Беларусі, Расіі і Польшчы. Пры гэтым, «…ілюструючы пару дзясяткаў народных танцаў, Буйніцкі надаваў ім толькі асабістую жывасць і бойкасць, але не мадэрнізаваў іх ніякімі новымі штрыхамі. Класічнай пластыкай яны не вызначаліся. Яны заставаліся як бы сырым этнаграфічным матэрыялам» [2, с. 58].

Аб багацці тэатралізацыі і высокім драматычным майстэрстве ў выкананні танцаў Першай беларускай трупай сведчаць шматлікія водгукі, якія перыядычна з'яўляліся ў «Нашай ніве». Тое ж пацвярджае нязменны ўдзельнік трупы, цымбаліст І. Голер [2, с. 83-85].

Тэатральная душа народа раскрываецца праз гульнявую прыроду танцаў, якую добра перадаваў Ігнат Цярэнцьевіч і яго артысты. Большасць танцавальных нумароў праграмы мела пэўны сюжэт і з'яўлялася практычна танцамі-пантамімамі, у якіх ўдзельнікі багата выкарыстоўвалі артыстычныя сродкі. Кожны танец меў сваё тэматычнае асэнсаванне. «…Напрыклад, у танцы «Юрачка» высмейваліся капрызныя жаніхі. Гэта быў адзін з улюбёных танцаў Буйніцкага, які ён выконваў з бляскам, весела, зухавата, з парадыйнай мэтанакіраванасцю, што выяўлялася і ў адпаведных рухах і жэстах ног і рук, і ў мініцы твару. Усё гэта рабілася без «нацыску», без выкарыстання штучных ці вульгарных прыёмаў» [2, с. 64].

І.Ц. Буйніцкі збіраў узоры народных касцюмаў, якія ўражвалі гледачоў сваёй маляўнічасцю і самабытнасцю, а для дэкарацый калекцыяніраваў арнамент і роспіс. Гарызонт і кулісы вырабляліся з беларускіх абрусоў, посцілак і ручнікоў.

Безумоўным сведчаннем вялікага арганізатарскага, рэжысёрскага і педагагічнага таленту Ігната Цярэнцьевіча было тое, што ў час шматлікіх паездак па Беларусі, і нават у час гастроляў у Пецярбургу ён шукаў здольных аматараў, праводзіў з імі рэпетыцыі, і праз пару гадзін яны ўжо выступалі ў складзе яго трупы. Гэта акалічнасць адыграла станоўчую ролю ў росце аматарскага руху на Беларусі, таму што кіраўнік Першай трупы пакідаў рэпертуар, даваў рэкамендацыі для далейшай працы, аказваў практычную дапамогу, дзякуючы чаму ствараліся і дзейнічалі новыя калектывы.

Падводзячы вынікі усяму вышэй напісаму, неабходна адзначыць, што вялікая папулярнасць Першай беларускай трупы пад кіраўніцтвам І.Ц. Буйніцкага была абумоўлена шэрагам прычын: 1) выкарыстанне фальклорнай творчасці народа ва ўсёй яе тэматычнай, жанравай, мастацка-эстэтычнай разнастайнасці; 2)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грунтаванне дзейнасці калектыва Буйніцкага на вопыце “беларускіх вечарынак» і тэатральнага калектыва А. Бурбіса ў Вільні; 3) сінтэтычнасць выступленняў трупы; 4) спалучэнне беларускага фальклору і вопыту суседніх дзяржаў, што прывяло да выпрацоўкі ўласнага, адметнага ад іншых народаў, стылю творчасці і зараджэння нацыянальнай акцёрскай школы; 5) даступнасць рэпертуару трупы і яго адпаведнасцьць патрабаванням часу; 6) «сямейны» склад трупы; 7) гарманічнае спалучэнне мастацкіх сродкаў розных акцёрскіх «школ»: «школы «тэатра перажывання» і «школы «тэатра прадстаўлення»; 8) гранічная лаканічнасць і імкненне перадаць нацыянальны каларыт у мастацкім афармленні спектакляў шляхам выкарыстання ручнікоў, выцінанак і іншых вырабаў народных майстроў; 9) актыўная сатворчасць з гледачом ў выглядзе сумесных танцаў напрыканцы выступленняў; 10) выкарыстанне мабільнай формы вандроўнага тэатра; 11) вялікі ўплыў на зараджэнне новых танцавальна-тэатральных гурткоў на тэрыторыі ўсёй краіны.

У цэлым, творчая дзейнасць Першай беларускай трупы пад кіраўніцтвам І.Ц. Буйніцкага не толькі стала паваротным этапам у развіцці сцэнічнага мастацтва Беларусі пачатку XX стагоддзя, але і прадвызначыла далейшае развіццё беларускага прафесійнага тэатра, паўплывала на арганізацыю Першага беларускага таварыства драмы і камедыі, стала асновай для стварэння Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

**Спіс літаратуры:**


1. Буйницкий, Игнат Терентьевич [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://ru.wikipedia.org/wiki/. – Дата доступа : 09.04.2016.
2. Няфёд, У. І. Ігнат Буйніцкі – бацька беларускага тэатра: вачыма сучаснікаў і ў памяці нашчадкаў / У. І. Няфёд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 124 с.



***Юрий Бундин***


## ЭОРТОТЕРАПИЯ В КОРРЕКЦИОННОЙ ШКОЛЕ


*В статье исследуется одно из наиболее важных свойств праздника – свойство оказывать оздоравливающее воздействие на людей.*



***Yuri Bundin***


## EORTOTHERAPY IN CORRECTIONAL SCHOOLS


*The article examines one of the most important holiday features – to have positive influence on peoples' health.*


Праздник как альтернатива повседневности, как время, свободное от трудов, забот и страхов сопровождает человека с самых древних времен, выполняя целый ряд социально значимых функций. С давних пор люди понимали, что праздник – это что-то иное и одновременно очень важное в их жизни. Именно праздник с его всеобщей атмосферой радости дает людям чувство свободы, единения и гармонии с окружающим миром. Современные исследователи праздника обращают внимание, что, несмотря на свою изменчивость, он «неизменен в главном, самом существенном своем качестве: способности восстанавливать цельность человека, гармонию между людьми и природой» [1, с. 32].

Праздник давно исследуется в науке, однако практически вне поля зрения ученых остается одно из наиболее важных свойств этого социокультурного феномена – свойство оказывать оздоравливающее воздействие на людей. В этой связи такого рода эортотерапевтические исследования представляются весьма и весьма актуальными.

Эортотерапия (греч. ἑορτή θέρα лечебный уход, лечение, восстановление здоровья») или лечение праздником, достаточная новая постановка вопроса в сфере психотерапии, психокоррецции и социальной адаптации. Некоторые идеи, касающиеся возможностей и перспектив эортотерапии, были высказаны автором осенью 2015 года на международной научно-практической конференции «Арт-терапия в практической деятельности» в Санкт-Петербургском государственном институте психологии и социальной работы [2].

Суть этих идей заключается в том, что праздник в силу своей специфики социо-художественного феномена способен особым образом интегрировать различные виды терапии искусством, оказывая тотальное, комплексное воздействие на психику человека. Как и сам праздник, так и все практикуемые сегодня виды арт-терапий, по сути опираются на единый механизм актуализации коллективного бессознательного при помощи различных, соответствующих видам искусств образов: музыкально-звуковых, вокально-речевых, телесно-двигательных, визуально-изобразительных и иных, их символических и метафорических значений и символов. Таким образом возникает особый арт-терапевтический эффект праздника – включается системное качество совокупности арт-терапевтических приемов, как это имеет место, например, в фольклоротерапии. Собственно говоря, народный фольклорный праздник – это есть одна из форм эортотерапевтической сессии.

Особо значение праздник имеет в жизни ребенка. Игровые формы коллективных праздничных действ и обусловленное ими чувство радости являются «альфой и омегой» всякого детства. Обращение к архетипическим структурам сознания, формирующегося в процессе онтогенеза, позволяет выдвинуть предположение о наличии праздничных механизмов психотерапевтического и психокоррекционного воздействия на ребенка, повышение эффективности его социальной адаптации.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ